НАША ПАМЯЦЬ

# Выпіў поўную чару жыццёвых выпрабаванняў

**«Вайна не шкадавала ні дзяцей, ні старых, ні жанчын – гінулі ўсе незалежна ад узросту, полу. Той час успамінаць страшна, але і забыць нельга», – казаў наш зямляк Сяргей Якаўлевіч Дзмітрыеў.**

А ведаў ён пра жахі ліхалецця не з чыіхсьці чужых слоў. Ён са зброяй у руках бараніў нашу Бацькаўшчыну ад карычневай чумы, а потым узнімаў яе з пажарышчаў і руін, аднаўляў народную гаспадарку роднага краю. І гэты аповед пра Сяргея Якаўлевіча, сціплага чалавека, адданага Айчыне, руплівага вяскоўца і добрага сем'яніна. На жаль, яго ўжо няма сярод нас, але ў памяці блізкіх ён па-ранейшаму жывы…

Нарадзіўся Сяргей Якаўлевіч у 1926 годзе ў вёсцы Верачагошч у сялянскай сям'і. Так сталася, што з маленства яму давялося зведаць нямала горычы. Яго бацька яшчэ да пачатку Вялікай Айчыннай быў сасланы ў Архангельск. І Сяргей хлапчуком узваліў на сябе частку клопатаў па гаспадарцы, каб дапамагчы матулі. Яна ж засталася адна з двума малымі сынамі на руках. Працавітая, дбайная і вельмі дабрадушная жанчына нікому не скардзілася на лёс. Шчыравала з рання да змяркання, каб усюды ўправіцца і паспець выканаць усе справы. І дзяцей вучыла быць адказнымі за ўчынкі і словы, не кідаць іх на вецер.

**Старэйшы сын добра засвоіў тыя ўрокі і парады маці. І, бадай, менавіта яны дапамаглі хлопцу не скарыцца і не ўпасці духам, а ісці далей і супрацьстаяць цяжкасцям, калі раптоўна не стала самага блізкага чалавека. Матуля загінула ад рук немцаў у пачатку вайны: яе бязлітасна расстралялі на вачах сына.**

І гэта абставіна пасяліла ў сэрцы юнака непрымірымую нянавісць да непрыяцеляў. Ён горача жадаў помсты, але на фронт пакуль не бралі. Ды і іншых турбот хапала: яму давялося клапаціцца пра меншага брацікі Аркадзя (малодшага на 9 гадоў) і самастойна даглядаць сядзібу.

А сваю барацьбу з фашыстамі наш зямляк пачаў у 1944-м, пасля вызвалення Беларусі. Быў прызваны ў Чырвоную Армію ў ліпені, адразу трапіў у 68-ы механізаваны корпус стралком. Разам з іншымі савецкімі байцамі вёў упартую барацьбу з акупантамі. Удзельнічаў у шэрагу аперацый. Але самым крытычным момантам для Дзмітрыева стаў разгром кёнігзбергскай групы нямецкіх войскаў і штурм сталіцы Усходняй Прусіі. Нашым салдатам трэба было прарваць тры лініі абароны. Па-першае, крапасныя форты, або, як іх называлі, «начныя кашулі» Кёнігзберга, мяркуючы, што за гэтымі сценамі можна спаць спакойна. Другая лінія абароны была ўладкавана на ўскраінах, трэцяя – уздоўж старой прыгоннай сцяны ўжо ў самім горадзе. У сваю чаргу фашысты імкнуліся любым спосабам утрымаць яго і не дапусціць страту кантролю над Усходняй Прусіяй, якая прыкрывала подступы да цэнтральных раёнаў Германіі. Таму разгарнуліся самыя жорсткія баі, што каштавалі вялікіх ахвяр. І ў адным з іх падчас перастрэлкі варожая куля напаткала Сяргея Дзмітрыева, ён атрымаў цяжкае раненне. Адразу ж быў напраўлены ў шпіталь. А пасля працяглага лячэння дэмабілізаваны па інваліднасці.

Баявы шлях Сяргея Якаўлевіча адзначаны шматлікімі ўзнагародамі: ордэнамі Славы, Айчыннай вайны першай ступені, медалём «За перамогу над Германіяй» і г.д. Дарэчы, сярод іх захоўваецца і паведамленне ўжо на пажаўцелай ад часу паперы, якое сведчыць, што загадамі Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна ад 17 і 18 студзеня 1945 года чырвонаармейцу Дзмітрыеву аб'яўлена Падзяка за выдатныя баявыя дзеянні ў саставе злучэння пры прарыве абароны немцаў на заходнім беразе ракі Нараў з паўночнага боку ад Варшавы, а таксама пры вызваленні горада Прасныш і іншых населеных пунктаў. А гэта яркае сведчанне адвагі і доблесці нашага земляка.

Вярнуўшыся на родную зямлю, ён сустрэўся з аднавяскоўкай Ганнай, якая таксама выпіла сваю чару іспытаў – на працягу вайны рабіла на распрацоўцы лесу ў Мурманскай вобласці. І яны стварылі дружную сям'ю.

**Пражылі разам 55 гадоў, выхавалі чатырох дачок. Адна з іх жыве на Любаншчыне, у аграгарадку Сосны 1. Часта прыгадвае тату як чулага, добразычлівага і руплівага чалавека. Пасля ліхалецця ён звыш 40 гадоў быў паштальёнам, дастаўляў перыядычныя выданні і карэспандэнцыю жыхарам Рэдкавіч, Чачэнска і Верачагошча.**

Як зазначае Галіна Сяргееўна, вайна ў душы бацькі пакінула балючую, незагойную рану. Але ён ніколі не выказваў нараканняў. А сваім дзецям і ўнукам да апошняга наказваў любіць родную зямлю, быць сапраўднымі патрыётамі.

**Наталля ВІЛЕНТА.**



**Нягледзячы на ўсе іспыты лёсу, Сяргей ДЗМІТРЫЕЎ быў аптымістам і сваёй бадзёрасцю зараджаў родных.**



ТОВ. ___________
(звание)
___________
(фамилия, имя и отчество)

Приказами Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина от 17 января 1945 года за № 224 и от 18 января 1945 г. за № 226 Вам **объявлена благодарность** за отличные боевые действия в составе соединения при прорыве обороны немцев на западном берегу реки Нарев севернее Варшавы и при освобождении 18 января гор. Псашныш (Прасныш) и др. населенных пунктов.

КОМАНДИР ___________
(звание, подпись)

КП-19864 Д. 6829

**У сямейным архіве захавалася і Падзяка за баявыя дзеянні.**





**Ордэн Айчыннай вайны за вытрымку і адвагу ў гады ліхалецця.**





**За кожнай узнагародай – гераізм і стойкасць.**